Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна

№ 9 (400) | Субота, 12 сакавіка 1960 года. | Цана 10 кап.

## ЧЫТАЙ СЁННЯ


- Вучоны савет абмяркоўвае пытанні выхаваўчай работы— 1 стар.
- Кнігі аб У. І. Леніне— 1 стар.
- Па ўніверсітэту — 1 стар.
- На гадзіннікавым заводзе — 1 стар.
- Гісторыя аднаго кахання (фельетон) — 2 стар.
- Заключны акорд лыжнікаў — 2 стар.
- Аб'явы Данілы Шылы — 2 стар.
- Агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці — 2 стар.


# ВУЧОНЫ САВЕТ АБМЯРКОЎВАЕ ПЫТАННІ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ

На сваім чарговым пасяджэнні Вучоны савет універсітэта абмеркаваў даклад «Пастанова ЦК КПСС аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах і мерапрыемствы па паляпшэнню ідэйна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў», з якім выступіў загадчык кафедры гісторыі КПСС Ф. П. Шмыгаў.

— У Пастанове ЦК партыі аб задачах прапаганды ў сучасных умовах,— сказаў дакладчык,—заключана ўсеабдымная праграма ідэалагічна-выхаваўчай работы ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства. Гэтая пастанова мае для нас выключнае значэнне. На яе аснове павінна быць перабудавана работа ўсіх без выключэння кафедраў, павінен быць рэзка павышаны ідэйна-тэарэтычны ўзровень выкладання.

Між тым, у вучэбнай і выхаваўчай рабоце ва універсітэце ўсё яшчэ маюць месца сур'ёзныя недахопы і ўпушчэнні. Аб іх, напрыклад, гаворыць той факт, што ў перыяд зімовай экзаменацыйнай сесіі многія студэнты атрымалі нездавальняючыя адзнакі. 150 чалавек дагэтуль яшчэ не ліквідавалі акадэмічную запазычанасць. Некаторыя выкладчыкі паранейшаму чытаюць лекцыі на нізкім тэарэтычным узроўні, часта па старых канспектах, складзеных некалькі год назад. Спецкурсы і спецсемінары адарваны ад актуальных праблем сучаснасці. Гэта асабліва датычыць такіх факультэтаў, як гістарычны, юрыдычны і філалагічны. На гістарычным факультэце, напрыклад, чытаецца спецкурс па гісторыі рэлігіі, разлічаны на 130 гадзін. Спецкурс ахоплівае толькі старажытнасць і часткова сярэднія стагоддзі. Студэнтаў жа цікавяць пытанні сучаснай рэлігіі, барацьбы з ёю, барацьбы з рэлігійнымі перажыткамі ў свядомасці людзей. На філалагічным факультэце спецкурсы накіраваны ў мінулае і не закранаюць актуальных праблем савецкай літаратуры.

Сярод часткі выкладчыкаў існуе думка, нібы выхаваўчай работай сярод студэнтаў павінны займацца толькі члены кафедраў грамадскіх навук, хоць выхаваўчая работа — ганаровая справа кожнага выкладчыка. Вучоныя—рэдкія госці ў інтэрнатах, многія з іх не ведаюць, чым жывуць студэнцкія калектывы, якія запатрабаванні студэнтаў.

У палітыка-выхаваўчай рабоце яшчэ нездавальняюча выкарыстоўваецца універсітэцкая радыёсетка, друк. Значная частка прафесарска - выкладчыцкага калектыву застаецца да гэтага часу па-за гурткамі і семінарамі палітычнай асветы. Яшчэ не ўсе з выкладчыкаў з'яўляюцца членамі Таварыства па пашырэнню палітычных і навуковых ведаў.

Выступіўшы ў спрэчках загадчык кафедры палітычнай эканоміі тав. Тамашэвіч падзяліўся вопытам умацавання сувязі навукі з практыкай, які набыла кафедра. Кафедра правяла сумеснае пасяджэнне з праўленнем аднаго калгаса Дзяржынскага раёна, на якім былі абмеркаваны пытанні пераходу ад працадня да грашовай аплаты, пытанні механізацыі і электрыфікацыі калгаснай вытворчасці. Цяпер наладжваецца сувязь з аўтазаводам і заводам аўтаматычных ліній. Работнікі кафедры акажуць дапамогу гэтым прадпрыемствам у распрацоўцы пытанняў зніжэння сабекошту прадукцыі.

Дэкан філфака прафесар М. Р. Ларчанка гаварыў аб тым, што сучаснасцю павінна быць прасякнута кожная лекцыя, кожны семінар, хоць бы і прысвечаныя праблемам мінулага.

— Патрэбна так чытаць лекцыі,— адзначыў ён,— каб яны запальвалі студэнтаў, ператвараліся ў задушэўныя гутаркі аб важнейшых пытаннях навукі. У нас жа нярэдка выкладчык не адрываецца ад канспекта, чытае манатонна, нудна, і, натуральна, студэнты не хочуць слухаць.

Выкладчык тав. Старавойтаў звярнуў увагу прысутных на работу нядаўна арганізаванага Клуба цікавых сустрэч. Гэта адна з новых форм выхаваўчай работы.

Патрэбна знайсці новыя формы работы і ў інтэрнаце, каб адпачынак студэнтаў тут не абмяжоўваўся выключна танцамі. Дацэнт Д. Е. Фактаровіч спыніўся ў сваім выступленні на пытаннях педагагічнай практыкі студэнтаў, умацавання сувязі са школамі і таксама на недахопах у рабоце ленінскіх куткоў у інтэрнатах, якія дагэтуль не адпавядаюць свайму прызначэнню.

У спрэчках выступілі т.т. Пятровіч, Цішчанка і іншыя. Прынята пастанова, накіраваная на ўхіленне выяўленых недахопаў і паляпшэнне вучэбнай і выхаваўчай работы.

Вучоны Савет абмеркаваў таксама пытанне аб падрыхтоўцы да Усесаюзнай міжвузаўскай канферэнцыі, якая будзе прысвечана брыгадам камуністычнай працы і адбудзецца восенню бягучага года ў нашым універсітэце.

## На гадзіннікавым заводзе

У мінулы чацвер група студэнтаў трэцяга курса аддзялення журналістыкі пабывала на Мінскім гадзіннікавым заводзе. Старшы інжынер тэхнічнага аддзела Васіль Лаўрэнцьевіч Гарахоўскі правёў экскурсантаў па галоўных цэхах завода. Студэнты азнаёміліся з вытворчым працэсам, пачынаючы з вырабу загатовак дэталей і канчаючы пускам гадзінніка ў ход. Экскурсавод расказаў многа цікавых фактаў, характарызуючых работу завода. Напрыклад, зараз у год выпускаецца 900 тысяч жаночых гадзіннікаў «Зара», а ў 1965 годзе будзе выпускацца 2 мільёны. Завод асвойвае выпуск мужчынскіх гадзіннікаў з механізмам «Зары». Цікавы і той факт, што гадзіннік «Зара» важыць усяго 8 з нямногім грамаў, а вага гадавой прадукцыі завода ... некалькі тон! Некаторыя дэталі ледзь можна ўбачыць няўзброеным вокам.

Студэнты-журналісты засталіся вельмі задаволеныя экскурсіяй.

Я. ЛЯХАЎ

## Па ўніверсітэту

### СЛОВА ПРА ЛЕНІНА

**Уладзімір Мікалаевіч Бернс доўгі час жыў на тэрыторыі Маскоўскага Крамля. Пасля Вялікага Кастрычніка ён неаднаразова сустракаўся з Уладзімірам Ільічом Леніным.**

**Аб гэтым геніяльным чалавеку і правадыру, аб незабыўных сустрэчах з ім Бернс расказаў нядаўна студэнтам фізічнага факультэта. З захапленнем праслухалі фізікі змястоўны цікавы расказ.**

У. БАБКОЎ.

### Студэнты ў майстэрнях

Па новаму вучэбнаму плану на фізфаку прадугледжаны вялікі практыкум у вытворчых майстэрнях. 102 гадзіны адведзены на тое, каб пазнаёміць будучых фізікаў са слясарнай і такарнай справамі, шклодзьмучай справай, практыкай мантажных работ па радыётэхніцы, фотасправай.

Вывучэнне фотасправы пачалося ўжо. У бліжэйшыя дні студэнты першага курса пачнуць праходзіць практыку ў вытворчых майстэрнях тэхнікума сувязі.

В. ШЭІН.

## Эстафета культуры

Мінскі абком камсамола праводзіць эстафету культуры. Камсамольская арганізацыя універсітэта павінна абслужыць усе калгасы і саўгасы Смалявіцкага раёна. Згодна з палажэннем аб эстафеце, гэтая дапамога будзе аказвацца ў розных формах. Студэнты універсітэта выступаюць перад працаўнікамі калгасных палёў з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, чытаюць даклады на розныя тэмы, выпускаюць насценныя газеты, арганізуюць фотавітрыны, кансультуюць удзельнікаў калгаснай самадзейнасці. З вялікім поспехам прайшоў вечар дружбы ў Смалявічах, дзе наша самадзейнасць дала вялікі канцэрт.

З 27 калгасаў і саўгасаў Смалявіцкага раёна эстафета культуры дастаўлена ўжо ў 19.

П. СЦІПЛОВІЧ.

### СУСТРЭЧА З ФУТБАЛІСТАМІ

Нядаўна ў клубе БДУ адбылася сустрэча з футбалістамі каманды «Беларусь», якая будзе ў гэтым годзе выступаць па класу «А». Трэнер каманды В. Новікаў расказаў аб тым, як трэніруюцца футбалісты, якія ў іх планы. Ён адказаў на шматлікія пытанні аматараў футбола і запэўніў іх, што ігракі «Беларусі» пастараюцца ў наступаючым сезоне парадаваць іх добрай гульнёй.

В. ДЫМОЎСКІ.

### КОРАТКА

**На хімфаку адбыўся вечар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння выдатнага рускага хіміка А. Е. Фаворскага, які шырока вядомы працамі ў галіне неарганічнай хіміі. З дакладам выступіў аспірант другога года навучання А. П. Матусевіч.**

**2 сакавіка начальнік станцыі візуальнага назірання за штучнымі спадарожнікамі Зямлі пры універсітэце дацэнт С. А. Пахута прачытаў студэнтам лекцыю «Праблемы заваёвы космасу». Лекцыя суправаджалася дэманстрацыяй навукова-папулярных фільмаў**

# *Кнігі аб У. І. Леніне, якія выйшлі з друку і паступілі ў бібліятэку БДУ*

1. **Гарбуноў, Н. П.** ЯК ПРАЦАВАЎ УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Аўтар, які быў у 1917—18 гадах сакратаром Саўнаркома, а з 1920 года упраўляючым справамі Саўнаркома, расказвае аб паўсядзённай рабоце У. І. Леніна, яго шматлікіх дзелавых сувязях з рознымі арганізацыямі і асобамі, уменні гутарыць з людзьмі.

2. **Горкі, М.** УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ ЛЕНІН. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Вядомага рускага пісьменніка і правадыра сусветнага пралетарыята У. І. Леніна звязвала вялікая шматгадовая дружба. Нарыс Горкага з'яўляецца лепшым, дасканалым да гэтага часу літаратурным партрэтам Уладзіміра Ільіча.

3. **Калантай, А. М.** УСПАМІНЫ АБ ІЛЬІЧУ. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

А. М. Калантай працавала пад кіраўніцтвам Леніна. У сваіх успамінах, жыва і цікава напісаных, Калантай расказвае аб Уладзіміру Ільічу як аб простым, сціплым чалавеку.

4. **Кржыжаноўскі, Г. М.** МЫСЛІЦЕЛЬ І РЭВАЛЮЦЫЯНЕР. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Г. М. Кржыжаноўскі—старэйшы член партыі бальшавікоў, відны вучоны—успамінае аб тым, як У. І. Ленін у першыя месяцы Савецкай улады ў разбуранай і галоднай краіне задумвае і планае ажыццяўляць вялікі план электрыфікацыі Расіі.

5. **Луначарскі, А. В.** РАСКАЗЫ АБ ЛЕНІНЕ. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Адзін з вядомых дзеячоў савецкай дзяржавы, былы наркам асветы Луначарскі быў звязаны па рабоце з У. І. Леніным і часта сустракаўся з ім. У брашуры сабраны кароткія, але яркія замалёўкі, якія раскрываюць воблік вялікага правадыра.

6. **Семашка, Н.** НЕЗАБЫЎНЫ ВОБРАЗ. М. Дзяржпалітвыдавецтва. 1959 год.

Аўтар брашуры—вядомы арганізатар аховы здароўя ў СССР, член РСДРП з 1893 года — расказвае аб жыцці Уладзіміра Ільіча ў эміграцыі ў Жэневе, аб дзейнасці Леніна як кіраўніка савецкай дзяржавы; аб незвычайнай увазе і чуласці да працоўных і таварышаў па рабоце, аб яго любві да дзяцей.

7. **Цэткін, К.** УСПАМІНЫ АБ ЛЕНІНЕ. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Успаміны Клары Цэткін—вядомага дзеяча Германскага і міжнароднага рабочага руху — аб сустрэчы з У. І. Леніным у дваццатыя гады ў Маскве, аб выступленнях Леніна на трэцім і чацвёртым кангрэсах Камінтэрна.

8. **Эссен, М. М.** СУСТРЭЧЫ З ЛЕНІНЫМ. М. Дзяржпалітвыдавецтва, 1959 год.

Успаміны М. М. Эссен — прафесіянальнай рэвалюцыянеркі-бальшавічкі, блізкага сябра сям'і Ульянавых — прысвечаны гадам эміграцыі (1902—1904 гг.) і вяртанню ў Расію ў 1905 годзе.

# ГІСТОРЫЯ АДНАГО КАХАННЯ

ФЕЛЬЕТОН

*Быў цудоўны зімовы дзень. У белым вэлюме, бы дзяўчаты на выданні, стаялі ва універсітэцкім скверы заінелыя дрэвы. Гэтую дату, 18 лютага 1957 года, запомніў ён на ўсё жыццё—у гэты ж дзень ён упершыню ўбачыў яе.*

*Няхай сабе скептыкі сцвярджаюць, што каханне з першага позірку — глупства, што такога не можа быць. Няхай сабе лектары пляву згаюць, што ў аснове гэтага высакароднага пачуцця павінна ляжаць сумесная работа ў камсамольскім бюро ці, на горшы канец, у студэнцкім навуковым гуртку. Дайце яму такога лектара, і ён цяпер дакажа, што гэта не так. Усё вырашыў першы позірк. Адзін-адзіны позірк, пасля якога ён зразумеў, што не можа жыць без яе.*

*Ён хутка дамогся свайго. Яна, як гэтага і трэба было чакаць, стала ягонай. І вось ужо два гады ён не можа прыйсці ў сябе ад шчасця. ад усведамлення таго, што яна з ім, што яны разам...*

*Праўда, быў час, калі над яго шчасцем пачалі збірацца чорныя хмары. Чорствыя людзі надумаліся разлучыць іх. Але ён мужна змагаўся за сваё шчасце і перамог.*

*Хто ён?*

*Студэнт V курса фізічнага факультэта Анатоль Гусакоў.*

*Хто яна?*

*Кніга, звычайная кніга.*

*Запавет Горкага «Любіце кнігу — крыніцу ведаў» Анатоль Гусакоў успрыняў у літаральным сэнсе. Як узяў гады два назад у бібліятэцы падручнік па англійскай мове і яшчэ некалькі кніг, так і дагэтуль не хоча расставацца з імі. Не аддае, і хоць ты трэсні! Бібліятэка шле яму адно напамінанне, другое, а ён і ў вус не дзьме.*

*А гісторыя кахання Соф'і Рэутовіч яшчэ больш павучальная. Першае яе спатканне з падручнікам па гісторыі СССР адбылося 23 сакавіка 1956 года. Соф'я — гісторык. Не дзіва, што яна любіць гісторыю. І даказвае гэта, не вяртаючы ў бібліятэку падручнік.*

*Уладзімір Лаўрукович і Святлана Караулава, Нэля Кліменка і Іна Ткачэнка таксама страсныя бібліяфілы. Іна Ткачэнка чытае і перачытвае рэдкае выданне Горкага, Уладзімір Лаўруковіч ужо два гады не можа прачытаць «Крыжаносцы» Стэфана Гейма, Нэля Кліменка зачытваецца Ясеніным і «Каралевай Марго». Урэшце, яе можна зразумець. Хіба лёгка адарвацца ад такіх радкоў:*

*«На бору со звонами*
*Плачут глухари.*
*Есть тоска весёлая*
*В алостях зари...»*

*Існуе і другі від кнігалюбаў. Яны імкнуцца ўзяць у бібліятэцы як мага больш кніжак, і як мага даўжэй не здаваць іх. Тут своеасаблівы рэкорд належыць Яўсею Гендалю. выпускніку матфака. У яго аж дзевяць бібліятэчных кніг, якія ён, напэўна, прывык ужо лічыць уласнымі. На другім месцы, гаворачы мовай спартыўнай, — Людміла Цімчанка, якая ўзяла ў мінулым годзе на свой абанемент 5 кніжак.*

*Своеасаблівы від кніжнага гангстэрства прымяніла Джэні Агіевіч, якая патаемна вынесла в чытальнай залы... дысертацыю! 8-га студзеня пад палой вынес кніжку з чытальнай залы Міхаіл Бычкоў, а вярнуў яе толькі 25 лютага. Ларыса Якаўлева вынесла з чытальнай залы кнігі 28 снежня, а здала іх—11 лютага. Дайшло да таго, што некаторыя студэнты лічаць за лепшае не паказвацца ў чытальную залу. Святлана Янушкоўская, Ніна Шустэрман, Рыта Фрыд, Людміла Багданава ніяк не могуць вярнуць вынесеныя адтуль кантрабандай кнігі.*

*Іх усіх можна было б зразумець і нават дараваць ім, калі б гэтыя падручнікі не патрэбны былі сотням іншых студэнтаў, калі б сотні і сотні нашых юнакоў і дзяўчат не захапляліся паэзіяй Сяргея Ясеніна, творчасцю А. М. Горкага. Ім можна было б дараваць, калі б не час, які яны адбіраюць у работнікаў бібліятэкі. Напамінанні — гэта, дробязь, гэта, што гарох аб сценку. Не раз хадзіла на дом да Іны Ткачэнкі бібліятэкар Раіса Ляховіч. Дзяўчына ветліва ўсміхалася, клялася вярнуць кнігі ў бліжэйшыя дні і забывалася на сваё абяцанне, як толькі за наведвальніцай зачыняліся дзверы.*

*Але ні пры якіх умовах нельга дараваць іншага. Нельга дараваць свядомага псавання кнігі. Падручнік «Асновы фізікі калоіднай хіміі», пабываўшы ў руках студэнткі III курса біялагічнага факультэта І. Кішко, стаў падобны на марака, пакрытага татуіроўкай. Амаль кожны радок падручніка яна тлуста падкрэслівала каляровымі алоўкамі. А І. Клімаў у двух месяцах вырваў з падручніка старонкі. Па яго слядах пайшлі Ірына Шабловская і Глафіра Шышко.*

*Калі студэнт паламае крэсла, ён не пазбегне дэканата. Аб ім будуць гаварыць на камсамольскім сходзе. Калі ён надэбашырыць у інтэрнаце, строгая вымова і высяленне яму забяспечаны. А хіба ж меншае варварства псаванне самага каштоўнага, што стварыла чалавецтва — кніжак, хіба ж гэта таксама не злачынства? Дык чаму ж камсамольскія арганізацыі не вядуць барацьбы з гэтым злом?! Чаму старшыня прафкома тав. Васін біў сябе ў грудзі, абяцаючы дапамагчы бібліятэцы сыскаць кніжкі, і чаму да гэтага часу пальцам не крануў, каб выканаць свае абяцанне? Чаму дэканы факультэтаў захоўваюць алімпійскі спакой, калі іх просяць уздзейнічаць у адміністрацыйным парадку на злосных парушальнікаў правіл карыстання бібліятэкай, чытальнымі заламі і кабінетамі універсітэта?*

*Пара канчаць з гэтым! Час перайсці ў наступленне на Анатоля Гусакова, Соф'ю Рэутовіч і ім падобных «аматараў» кнігі. Перайсці ў наступленне шырокім фронтам, ад камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый да дэканатаў. Стварыць вакол іх грамадскую думку, прымусіць шанаваць КНІГУ!*

*А. ГАРЭЗНЫ*

СПОРТ

## Заключны акорд лыжнікаў

Раён станцыі Зялёная добра вядомы лыжнікам універсітэта. Яшчэ нядаўна на лыжных трасах гэтага раёна яны атрымалі бліскучую перамогу, выйграўшы першынство ВНУ рэспублікі. А 21-га і 28-га студзеня аматары лыжнага спорту зноў з'ехаліся сюды, каб прыняць удзел у спаборніцтвах на першынство універсітэта.

У праграму спаборніцтваў у жанчын уваходзілі лыжныя гонкі на 3, 5 і 10 кіламетраў і эстафета 3×3 кіламетры. Мужчыны спаборнічалі на дыстанцыях у 10, 15 і 30 кіламетраў, а таксама ў эстафетнай гонцы 4×5 кіламетраў.

У першы дзень былі разыграны эстафеты і гонкі ў жанчын на 10 кіламетраў ,а у мужчын на 30. У эстафетных гонках жаночых каманд перамогу з вялікай перавагай атрымалі географы з часам 43,28 мінуты (Ж. Капілевіч, Л. Калупаева, Л. Дрозд). На другім месцы была дружная каманда беларускага аддзялення (48, 05 мінуты), якая выйграла ў моцнай каманды фізічнага факультэта 25 секунд.

Географы перамаглі і ў мужчын. Іх каманда ў складзе В. Радашкевіча, М. Кіршанкова. Л. Лазоўскага, П. Явіда ў эстафетнай гонцы 4×5 паказала час 1:35,53 гадзіны. На другім месцы засталіся фізікі (1:38,25 гадзіны). Лыжнікі беларускага аддзялення фінішавалі трэцімі.

Трэба сказаць, што першы дзень спаборніцтваў быў азмрочаны непрыемным здарэннем. Факультэты не забяспечылі яўку суддзяў і ў выніку некаторыя ўдзельнікі жаночай гонкі на 10 кіламетраў збіліся з дыстанцыі. Такая няўдача напаткала моцных гоншчыц Л. Новікаву, Л. Біркову, Алабіну. У выніку перамогу з часам 49,25 мінуты атрымала Людміла Барысевіч (беларускае аддзяленне).

Лыжная гонка ў мужчын на 30 кіламетраў прынесла высокія паказчыкі. Першым на фінішы быў А. Галкоўскі. Яго час—1:54,42 гадзіны. Усяго паўмінуты прайграў яму Віктар Кісялёў (геафак). І Галкоўскі і Кісялёў паказалі вынікі першага разраду.

Другі дзень спаборніцтваў прынес нямала высокіх дасягненняў. У гэты дзень поспех усё часцей і часцей спадарожнічаў спартсменам геафака, якія выступалі па-за ўсялякай канкурэнцыяй. Гонку на тры кіламетры ў жанчын выйграла іх прадстаўніца Ліля Калупаева (14 мін. 45 сек.). А Жана Капілевіч была трэцяй, прапусціўшы ўперад Валю Конаш (беларускае аддзяленне).

У гонцы на 5 кіламетраў першынствавала Ліда Новікава, прадстаўніца матэматычнага факультэта. Яна паказала вынік вышэй першага разраду—22,20 мінуты. Затое другое і трэцяе месцы засталіся за спартсменкамі геаграфічнага факультэта Люсяй Бірковай (22,50 мінуты) і Валяй Дрозд (24,40).

Гонка на 10 кіламетраў у мужчын азнаменавалася яшчэ двума першаразраднымі вынікамі. Выйграў яе Яўгеній Кухарэнка (гістфак) з вельмі добрым часам — 35,5 мінуты. Другім быў Леанід Лазоўскі (геафак), трэцім — Пётр Явід (геафак). Леанід і Яўгеній упершыню выканалі норму першага спартыўнага разраду. Ад спаборніцтваў да спаборніцтваў прагрэсіруе вельмі здольны лыжнік Аляксандр Галкоўскі. 21 лютага ён выйграў гонку на 30 кіламетраў, а стартаваўшы 28 лютага на 15 кіламетраў, прайшоў гэтую дыстанцыю за 55 мінут роўна. Адзін за другім фінішуюць іншыя ўдзельнікі спаборніцтваў. Аднак нікому не ўдаецца прайсці гэтую дыстанцыю хутчэй Аляксандра Галкоўскага. Толькі В. Кісялёў наблізіўся да яго па свайму часу — 55,32 мінуты. Аднак і гэты вынік намнога вышэй першаега разраду.

У выніку двухдзённай напружанай барацьбы першае месца заваявала каманда геафака— 13 ачкоў. Яна намнога апярэдзіла гісторыкаў, якія, набраўшы 26 ачкоў, выйшлі на другое месца. Вялікі поспех выпаў на долю лыжнікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры, якія здолелі апярэдзіць моцныя каманды матэматычнага і фізічнага факультэтаў і заняць пачэснае трэцяе месца. Вельмі дрэнна выступала каманда аддзяленняў рускай мовы і літаратуры і журналістыкі. Яна і засталася на апошнім, дзевятым, месцы.

Усяго ў спаборніцтвах прынялі ўдзел 283 чалавекі. Паказана шэсць вынікаў вышэй першага разраду. Шэсцьдзесят чалавек выканалі ўпершыню нормы другога і трэцяга спартыўнага разрадаў. Нядрэнны заключны акорд лыжнікаў на канец сезона!

В. НІКІЦІН

Рэктарат, партком, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі універсітэта аб'яўляюць

### АГЛЯД-КОНКУРС

мастацкай самадзейнасці факультэтаў.

Мэтай конкурса з'яўляецца выяўленне найбольш таленавітай і здольнай моладзі для папаўнення калектываў мастацкай самадзейнасці, а таксама павышэнне іх майстэрства і выяўленне факультэта, які мае лепшыя паказчыкі ў пастаноўцы культурна-масавай работы. Пры вызначэнні факультэта-пераможцы агляда-конкурса будуць улічвацца: а) масавасць, б) якасць выканання, в) разнастайнасць форм мастацкай самадзейнасці, г) ідэйны змест рэпертуара.

У конкурсе-аглядзе могуць прыняць удзел кожны калектыў мастацкай самадзейнасці і кожны асобны выканаўца. Пераможцы будуць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі і ганаровымі граматамі рэктарата.

У склад журы ўвайшлі: **А. Я. Малышаў** (старшыня), **В. І. Старавойтаў** (намеснік старшыні), **М. Ціханенка** (сакратар), **А. Ванькевіч** (сакратар камсамольскай арганізацыі універсітэта), **В. Пракошын** (адказны ад камітэта камсамола), **В. Баркун** (адказны ад прафбюро), **Н. П. Хрыпко** (адказная ад мясцкома) і кіраўнікі калектываў мастацкай самадзейнасці **С. Г. Новік, Л. М. Тамільчык, В. Ф. Гур'еў, А. С. Ліўшыц, А. Ф. Кавецкі, Л .К. Александровіч, М. Н. Лісіцын.**

**ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ АГЛЯДА-КОНКУРСА:**

26 сакавіка — юрфак, філфак,
27 сакавіка — істфак, біяфак, геафак.
33 сакавіка — фізфак, матфак,
2 красавіка — заключны канцэрт.

## Аб'явы Данілы ШЫЛЫ

**КАФЕДРА ФІЗВЫХАВАННЯ І СПОРТУ**

паведамляе, што студэнты другога курса філалагічнага факультэта В. Савіч, В. Дайкун

спаборнічаюць

па колькасці прапушчаных гадзін па фізкультуры.

Даўжнікі (чытай: не здаўшыя залікі і экзамены): Б. Бетчар — III курс аддзялення рускай мовы і літаратуры, І. Матусевіч — IV курс гэтага ж аддзялення сістэматычна праводзяць

кансультацыі

на тэму: «Як увільнуць ад вывучэння праграмных дысцыплін?».

Студэнт II курса аддзялення журналістыкі А. Куляшоў праводзіць

гутаркі

з парадкам дня: 1. Як выкруціцца ад выканання грамадскіх даручэнняў?

2. Абяцаць можна ўсё. Абяцанне — не выкананнанне.

Насценнай газеце «Пражэктар» (інтэрнат па вул. Свярдлова, 34)

ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЮЦЦА

карэспандэнты і выпускаючы. За даведкамі звяртацца да рэдактара газеты У. Верамейчыка.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 06850 Зак. 536 Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.